# 11 клас

## 2 тур

Паважаныя ўдзельнікі алімпіяды! Вам прапаноўваюцца практычныя заданні, на якія неабходна даць адказы. Адказы неабходна запісваць у адведзенных для іх месцах акуратным, разборлівым почыркам.

Жадаем вам поспехаў!

| I. | **Выберыце правільны варыянт адказу.** |
|---|---|

**За кожны правільны адказ – 1 бал**

| **Гісторыя Беларусі** | **Сусветная гісторыя** |
|---|---|
| **1.** Найбольш старажытныя курганныя пахаванні бронзавага веку выяўлены на тэрыторыі Беларусі каля вёскі:<br>а) Адаменка Быхаўскага раёна<br>б) Ходасавічы Рагачоўскага раёна<br>в) Малышкі Вілейскага раёна<br>г) Мілаград Рэчыцкага раёна<br>**2.** Старажытная форма рэлігійных вераванняў, якая ў параўнанні з іншымі мае найбольш працяглую гісторыю існавання:<br>а) анімізм<br>б) татэмізм<br>в) фетышызм<br>г) магія<br>**3.** Балты – гэта<br>а) прадстаўнікі германскіх плямёнаў, якія пашыралі свой уплыў у Еўропе<br>б) аўтахтоннае насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Беларусі ў час да славянскай каланізацыі<br>в) продкі славян<br>г) прышлае насельніцтва – алахтоны – на беларускіх землях у VII ст. н.э.<br>**4.** Заканадаўчы акт, якім у ВКЛ вялікі князь надаваў або пацвярджаў асаблівыя правы пануючаму класу, саслоўю, пэўнай | **17.** Сталіцай Хетскай дзяржавы быў горад<br>а) Эбла<br>б) Ларса<br>в) Хатусас<br>г) Угарыт<br>**18.** Важным наступствам перамогі германскага караля Атона I ў 955 годзе ў бітве на р. Лех было:<br>а) стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі<br>б) вызваленне ад арабаў Пірэнейскага паўвострава<br>в) утварэнне Папскай дзяржавы<br>г) спыненне набегаў венграў на Еўропу<br>**19.** З 1338 па 1573 гг. Японіяй кіравалі:<br>а) шматлікія даймё<br>б) сёгуны з роду Асікага<br>в) сёгуны клана Такугава<br>г) імператары Кіота<br>**20.** Прыняты ў 1689 г. англійскі “Біль аб правах” змяшчаў:<br>а) абмежаванне зямельных надзелаў<br>б) аддзяленне англіканскай царквы ад дзяржавы |

сацыяльнай ці этнічна – рэлігійнай групе, асобе – гэта
а) латыфундыя
б) прывілей
в) фальварак
г) юрыдыка

**5.** Першы летапісна дакладна вядомы полацкі епіскап, які прыгадваецца пад 1105 г.
а) Іаан
б) Нікіфар
в) Фама
г) Міна

**6.** Апісанне жыцця святых і праведнікаў – гэта
а) акафіст
б) вайнаг
в) агіяграфія
г) евангеле

**7.** Свінцовая пячатка Ефрасінні Полацкай з надпісам: «Г/оспод/и помози Рабе своеи Ефросини нарецаемой» была знойдзена ў
а) Тураве
б) Полацку
в) Ноўгарадзе
г) Кіеве

**8.** Вайна паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам, па выніках якой у Масквы быў адваяваны Гомель, праходзіла ў:
а) 1512 – 1522 г.
б) 1534 – 1537 г.
в) 1539 – 1542 г.
г) 1542 – 1547 г.

**9.** Адзначце рэгіён пол іэтнічнага насельніцтва, у якім доўгі час не былі дакладна акрэслены граніцы Кароны і Княства:
а) Палессе
б) Заходняе Падляшша
в) Занёманне
г) Аўкштайція

**10.** Найбольш буйная бітва падчас паўстання 1794 г. на Беларусі адбылося пад

в) рэалізацыю прынцыпу падзелу трох ўлад
г) забарону каралю прызначаць і збіраць падаткі

**21.** Камунальны рух гэта:
а) працэс стварэння гарадоў у раннім сераднявеччы
б) працэс стварэння рамесных цэхаў
в) барацьба рамеснікаў супраць цэхавага кіраўніцтва
г) барацьба гараджан за самакіраванне

**22.** Фактар “адкладзенага пытання” у насельніцтва ў 1920-я гг. з’явілася следствам:
а) народных хваляванняў
б) Першай сусветнай вайной
в) стварэння Лігі нацый
г) Парыжскай мірнай канферэнцыі

**23.** План Каломба прадугледжваў:
а) стварэнне сістэмы align=рознабаковай дапамогі краінам Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі
б) захоп Цібета Кітаем
в) стварэнне ЕЭС
г) уварванне паўночнакарэйскай арміі ў Паўднёвую Карэю

**24.** У выніку рэформ 1860-1880-х гг. Б. Дізраэлі і У. Гладстана ў Велікабрытаніі:
а) ураўнаваны паўнамоцтвы палаты суполак (общин) і палаты лордаў
б) выбарчыя правы атрымалі жанчыны
в) колькасць выбаршчыкаў павялічылася да 5,5 млн. чалавек
г) была створана шматпартыйная сістэма

**25.** Гэты фронт пад камандаваннем І.Д. Черняхоўскага (потым А.М. Васілеўскага) ваяваў ва Ўсходняй Прусії ў гады Вялікай Айчыннай вайны
а) 1-ы Прыбатыйскі
б) 2-гі Беларускі

а) Слонімам
б) Крупчыцамі
в) Любанню
г) Брэстам

**11.** Пачаткам «разбуральнага веку» у гісторыі Беларусі называюць
а) Лівонскую вайну
б) вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг.
в) казацка-сялянскую вайну 1648 – 1651 гг.
г) Паўночную вайну

**12.** Падбярыце да пераліку абагульняючае слова: службы, дворышчы, дымы, жарэб'і
а) селянская павіннасці
б) меры плошчы
в) надзелы сялян
г) гаспадаркі шляхты

**13.** Рэлігійны вальнадумец, які збег у Беларусь з Маскоўскай дзяржавы і далучыўся да беларускіх антытрынітарыяў
а) Васіль Цяпінскі
б) Сымон Будны
в) Пётр Скарга
г) Феадосій Касы

**14.** Расійскі манарх, па ўказу якога ў Беларусі ўводзілася выкладанне ва ўсіх навучальных установах выключна на рускай мове
а) Паўла I
б) Мікалая I
в) Аляксандра I
г) Кацярыны II

**15.** Л.Радзівонава-Клячко, Р.Гершуні, Я.Гальперын, К.Брэшка-Брашкоўская, А.Бонч-Асмалоўскі – гэта
а) рэвалюцыйныя народнікі 70-х – пачатку 80-х гадоў XIX ст.
б) група народнікаў у Мінску, з якой звязана адраджэнне рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 90-х гадоў XIX ст.
в) прадстаўнікі ліберальнага народніцтва ў Беларусі
г) кіраўнікі сацыял-дэмакратычных гурткоў

в) 3-ці Беларускі
г) 1-ы Беларускі

**26.** Пасля ўступлення на пасаду прэзідэнта ЗША Ф.Д. Рузвельт з мэтай пераадолення крызісу:
а) скараціў войска
б) распусціў кангрэс
в) адмяніў “сухі закон”
г) зачыніў усе банкі

**27.** Найбольш вострыя дыскусіі на канферэнцыі ў Ялце ў лютым 194 г. разгарнуліся па пытанню аб:
а) пакаранні ваенных злачынцаў
б) усходняй мяжы Польшчы
в) лёсе Усходняй Прусіі
г) межах Чэхаславакіі

**28.** Кітайская Савецкая Рэспубліка была абвешчана ў 1931 г. у горадзе:
а) Кантоне
б) Чжэньцзяне
в) Жуйцзіне
г) Шанхаі

**29.** Мэтай аперацыі “Блакітная зорка” у Індыі быў(было):
а) перасяленне жыхароў трушчобаў у вёску
б) пошук вінаватых у забойстве І. Гандзі
в) захоп святыні сікхаў – Залатога храма
г) вызваленне закладнікаў у амерыканскім пасольстве

**30.** Старажытнагрэчаскае слова “арыстакрат” перакладаецца як улада:
а) старэйшых
б) лепшых
в) заможных
г) мужных

**31.** Новы курс Камінтэрна, зацверджаны на VII Кангрэсе ў 1935 г., быў накіраваны на:
а) павелічэнне колькасці камуністычных партый

| | |
|---|---|
| Беларусі<br>**16.** Органы ўлады буржуазіі, якія ўзніклі на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.<br>а) Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў<br>б) грамадскія камітэты парадку<br>в) ваенна-рэвалюцыйныя камітэты<br>г) БНК | б) захаванне пазіцый камуністаў<br>в) пераход да нелегальным формам дзейнасці<br>г) аб'яднанне ўсіх антыфашысцкіх сіл<br>**32.** "Новая ўсходняя палітыка", абвешчаная СДПГ з канца 1960-х г., прадугледжавала:<br>а) супрацоўніцтва з усходнееўрапейскімі краінамі<br>б) прызнанне эфектыўнасці сацыялістычнага лагера<br>в) згоду на размяшчэнне савецкіх войскаў ў ГДР<br>г) узмацненне ваеннай прысутнасці НАТА ў Еўропе |

| **II.** | **Суаднясіце.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 1 бал

**33**) падзею і дату

| | |
|---|---|
| 1. Уваходжанне ў склад ВКЛ Віцебскага княства | А. 1307 |
| 2. Уваходжанне ў склад ВКЛ Полацкага княства | Б. 1315 |
| 3. Далучэнне да ВКЛ Берасцейскай зямлі | В. 1320 |
| 4. Усталяванне ўлады вялікага князя літоўскага ў Смаленску | Г. 1404 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

**34**) вялікага князя літоўскага і гады яго кіравання

| | |
|---|---|
| 1. Вітаўт Вялікі | А. 1392 – 1430 |
| 2. Казімір Ягелончык | Б. 1430 – 1432 |
| 3. Жыгімонт Кейстутавіч | В. 1432 – 1440 |
| 4. Свідрыгайла | Г. 1440 – 1492 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

**35**) імя палітычнага дзеяча і назву краіны

| | |
|---|---|
| 1. Альдо Моро | А. Злучаныя Штаты Амерыкі |
| 2. Джон Фіцджералд Кенэдзі | Б. Швецыя |

| | |
|---|---|
| 3. Гельмут Коль | В. Італія |
| 4. Улоф Пальме | Г. Федэратыўная рэспубліка Германія |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

**36**) гады заняцця пасады з Першымі сакратарамі ЦК КПБ

| | |
|---|---|
| 1. 1956-1965 | а). Т.Я. Кісялёў |
| 2. 1965-1980 | б). К.Т. Мазураў |
| 3. 1980-1983 | в) А.А. Малафееў |
| 4. 1989-1991 | г) П.М. Машэраў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

**37**) карціну і яе аўтара

| | |
|---|---|
| 1. “Пахаванне Гедыміна” | а). А. Гараўскі |
| 2. “Вечар у Мінскай губерні” | б). Н. Сіліванові́ч |
| 3. “Дзеці гуляюць у двары” | в). К. Альхімовіч |
| 4. “Каля ваколіц Пяцігорска” | г). В. Бялыніцкі-Біруля |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

**38**) аўтараў і творы музычнага мастацтва

| | |
|---|---|
| 1. А. П. Барадзін | а). опера “Барыс Гадуноў” |
| 1. М.А. Балакірыеў | б). опера “Садко” |
| 2. М.А. Рымскі-Корсакаў | в). опера “Князь Ігар” |
| 3.М.П. Мусаргскі | г.) сімфонія “Тамара” |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 – | 2 – | 3 – | 4 – |

| | |
|---|---|
| **III.** | **Размясціце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці.** |

За кожны правільны адказ – 1 бал

**39**) Мірныя пагадненні па часе іх падпісання:

| | |
|---|---|
| 1. Дэўлінскае перамір’е | 3. Пераяслаўская рада |
| 2. Ям-Запольскі мір | 4. Андросаўскі мір |

**40**) вялікіх літоўскіх князёў па часе кіравання:

| | |
|---|---|
| 1. Жыгімонт Кейстутавіч | 3. Казімір IV Ягелончык |
| 2. Шварн | 4. Віцень |

**41**) стварэнне дзяржаў

| | |
|---|---|
| 1. Аб’яднаныя Арабскія Эміраты | 3. Германская Дэмакратычная Рэспубліка |
| 2. Кітайская Народная Рэспубліка | 4. Дзяржава Ізраіль |

**42**) падзеі расійскай гісторыі XX ст.

| | |
|---|---|
| 1. Стварэнне Петраградскага савета | 3. Стварэнне Часовага Ўрада |
| 2. Адрачэнне Мікалая II ад прастола | 4. Карнілаўскі мяцеж |

**43**) помнікі архітэктуры Беларусі па часе іх узвядзення

| | |
|---|---|
|  1. |  2. |
| 3.  | 4.  |

| **IV.** | **Упішыце правільны адказ.** |
|---|---|
| За кожны правільны адказ – 1 бал | |
| **44.** | Сяляне ВКЛ, асноўнай павіннасцю якіх была ахова пушчаў вялікага князя літоўскага ці буйных феадалаў і удзел у паляванні называліся ________________ |
| **45.** | Росквіт абсалютызму ў Францыі належыць да часу кіравання караля, які кіраваў краінай на працягу 72 гадоў. Гэта кароль __________________________ |
| **46.** | Для зацвярджэння новага падаткаабкладання Людовік XVI склікаў 5 мая 1789 г. саслоўна-прадстаўнічы орган, ____________________________________, якія не збіраліся з 1614 г. |
| **47.** | У _____________ г. у Расіі ўпершыню быў скліканы Земскі сабор – сход прадстаўнікоў усіх пластоў насельніцтва (акрамя прыгонных сялян) |
| **48.** | Напачатку XVII ст. ў гэтай краіне скончыўся перыяд феадальнай раздробленасці і барацьбы за ўладу паміж феадаламі. Пад сваёй улада краіну аб’яднаў князь Такугава Іэясу. Гэта краіна __________ |
| **49.** | XII з’езд КПСС, які адбыўся ў кастрычніку 1961 г. прыняў новую Праграму партыі, у якой абвяшчаўся курс на пабудову ______________________________ |
| **50.** | У 1963 г. ______________ (прозвішча) першая жанчына у свеце здзейсніла палёт у космас. |
| **51.** | Знешнепалітычная канцэпцыя, згодна з якой СССР меў права на ваеннае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы любой дзяржавы Арганізацыі Варшаўскага Дагавора, калі гэтага патрабавалі абставіны. За Захадзе гэта канцэпцыя атрымала назву дактрына ______________________________________________ |
| **52.** | У другой палове 50-х г. XX ст. узнік рух, асноўнай мэтай якога было аслабленне міжнароднай напружанасці і правядзенне эканамічнай палітыкі, выгаднай развіваючымся краінам. Лідарам гэтага руху стала Індыя. Гэты рух атрымаў назву ______________________________________________. |
| **53.** | У 1820 г. па ініцыятыве студэнтаў Віленскага ўніверсітэта было створана Таварыства ______________________________________ . |

| V. | **Падпішыце партрэты гістарычных асоб.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 2 балы



**54**. ______________________________



**55.** ________________________________



**56.** ______________________________



**57.** ________________________________



**58**. ______________________________



**59.** ______________________________



**60.** ______________________________



**61.** ______________________________

| | |
|---|---|
| **VI.** | **Суаднясіце ўнутры- і знешнепалітычныя праграмы і іх стваральнікаў.** |

За кожны правільны адказ – 1 бал

| | | |
|---|---|---|
| **62.** | Кодэксы сумленнай канкурэнцыі | а) Дж. Ф. Кенэдзі |
| **63.** | Новыя рубяжы | б) В. Брант |
| **64.** | Стратэгічная абаронная ініцыятыва | в) Г. Макмілан |
| **65.** | Новая усходняя палітыка | г) Ф. Д. Рузвельт |
| **66.** | Вятры пераменаў | д) Р. Рейган |

| |
|---|
| 62 – ; 63 – ; 64 – ; 65 – ; 66 – . |

| | |
|---|---|
| **VII.** | **Напішыце аўтара дадзенага выказвання.** |

За кожны правільны адказ – 2 балы

| | | |
|---|---|---|
| **67.** | Першым правілам палітыкі павінна быць кіраванне народам – пры дапамозе розуму і ворагамі народа - пры дапамозе тэрору. | |
| **68.** | Ісціна – люстэрка, адлюстраванне якога невыносна для прытворства і крывадушнасці. | |
| **69.** | Багацце краіны не абавязкова будуецца на ўласных прыродных рэсурсах, яно магчыма нават пры іх поўнай адсутнасці. Самым галоўным рэсурсам з’яўляецца чалавек. Дзяржаве толькі трэба стварыць аснову для росквіту таленту людзей. | |
| **70.** | Ад вялікага да смешнага адзін крок | |
| **71.** | Не якой чужою моваю, а сваёй уласнай правы пісаныя маем | |
| **72.** | Розум – цудоўны дар Боскі, дзякуючы якому мы адрозніваемся ад жывёл | |

| **VIII.** | **Выканайце заданні па картасхемах.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 2 балы

**73.**




Сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы былі распаўсюджаны ў саюза плямён, якія пазначаны на карце лічбай _______

**74.**




Тэрыторыя першапачатковага фарміравання ВКЛ адзначана на карце лічбай __________

**75.**



Заштрыхаваная на карце тэрыторыя была далучана да ВКЛ у часы кіравання вялікага князя _________________

**76.**




Губерня, на тэрыторыі якой у 1820-я гады былі пабудаваны першыя фабрыкі на Беларусі пазначана на карце лічбай __________

**77.**




Рэгіён Беларусі, які ў XIV- XVI стст. называлі “Белая Русь”, абазначаны на карце лічбай ______________

**78.**




Месцазнаходжанне “Суражскіх варот”, якія існавалі з лютага па верасень 1942 г., абазначаны на карце лічбай ______

**79.**



Напішыце, як называецца беларуская губерня, якая заснавана у 1802 г. у складзе Расійскай імперыі і тэрыторыя якой заштрыхавана на карце ___________

**80.**




Горад, у якім дзейнічала першая ў межах сучаснай тэрыторыі Беларусі друкарня, абазначана на карце лічбай ____________

**81.**




Напрамак удару 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем Г. Захарава падчас аперацыі “Баграціён” пазначаны на карце лічбай ____________

**82.**




Цёмным колерам на карце пазначана тэрыторыя БССР пасля падпісання_____________________________

_____________________________________________

| IX. | **Падкрэсліце імёны палітыкаў (дзяржаўных дзеячаў) АДНОЙ краіны.** |
| --- | --- |

За кожны правільны адказ – 1 бал

**83**. Свідрыгайла, Дзмітрый Данскі, Міндоўг, Ян Жыжка.

**84**. Беніта Мусаліні, Эрнеста Чэ Гевара, Антоніў ді Салазар, Фідэль Кастра.

**85**. Альдо Моро, Хасэ Луіс Радрыгес Сапатэра, Сільвія Берлусконі, Ангела Меркель.

**86.** Гельмут Коль, Маргарэт Тэтчэр, Эмануэль Макрон, Конрад Адэнаўр.

**87**. Вацлаў Гавел, Войцех Ярузельскі, Лех Валенса, Желю Желев.

**88**. Хо Шы Мін, Мао Дзэдун, Во Нгуэн Зіап, Кім Ір Сэн.

**89**. Аманула-хан, Надзір-хан, Рэза-хан Пехлеві, Мухаммад Алі Джына

**90**. Хуан Дамінга Перон, Сальвадор Альендэ, Фернанду Энрыке Кардозу, Аўгуста Пінагчэт.

| **X.** | **Суаднясіце.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 1 бал

| **скульптурны помнік і гістарычнага дзеяча, якому ён прысвечаны** | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **91.** | Міхал Клефасас Агінскі | | **94.** | Францыск Скарына | | **97.** | Уладзімір Карват | |
| **92.** | Язэп Драздовіч | | **95.** | Марк Шагал | | **98.** | Альгерд | |
| **93.** | Леў Сапега | | **96.** | Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка | | **99.** | Рагнеда і Ізяслаў | |

| | | |
|---|---|---|
| <br>**А.** |  <br>**Б.** | <br>**В.** |

| | | |
|---|---|---|
|  **Г.** |  **Д.** |  **Е.** |

| | | |
|---|---|---|
|   **Ж.** |  **З.** |  **Л.** |

| **помнік архітэктуры і яго назву** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **100.** | Сабор святога Францыска Ксаверыя | | **103.** | Сабор у Реймсе | |
| **101.** | Сабор Васіля Блажэннага | | **104.** | Сабор Святой Сафіі | |
| **102.** | Храм Збаўлення Святога Сямейства | | **105.** | Мінарэт Кутб-мінар | |

| | | |
|---|---|---|
|  **А.** |  **Б.** |  **В.** |

| | | |
|---|---|---|
|  **Г.** |  **Д.** |  **Е.** |

| XI. | **Пазначце “птушкай” у адпаведным месцы, якая падзея адбылася раней.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 2 балы

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **106.** | | Першы ўспамін аб Маскве | **ці** | | Першы ўспамін аб Мінску |
| **107.** | | Захоп крыжакамі Канстанцінопаля | **ці** | | Бітва на Нямізе |
| **108.** | | Кальмарская ўнія, якая аб’яднала Данію, Швецыю, Нарвегію | **ці** | | Крэўская ўнія ВКЛ і Польшчы |
| **109.** | | Пачатак Трыццацігадовай вайны | **ці** | | Люблінская ўнія |
| **110.** | | “Доўгі парламент” ў Англіі | **ці** | | Чатырохгадовы сейм у Рэчы Паспалітай |
| **111.** | | “Бостанскае чаяванне” | **ці** | | Першы падзел Рэчы Паспалітай |
| **112.** | | Зваржэнне манархіі ў Францыі падчас Вялікай Французскай рэвалюцыі | **ці** | | Другі падзел Рэчы Паспалітай |
| **113.** | | Пачатак Грамадзянскай вайны ў ЗША (“вайна Поўначы з Поўднем”) | **ці** | | Пачатак паўстання на Беларусі пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага |

| XII. | **Вызначыце, якая краіна метраполіяй у адносінах да прыведзеных калоній.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 1 бал.

| | Каланіяльныя ўладанні | Метраполія |
|---|---|---|
| **114.** | Бірма | |
| **115.** | Мазамбік | |
| **116.** | Бераг Слановай Косткі | |
| **117.** | Нігерыя | |
| **118.** | Камерун | |

| | | |
|---|---|---|
| **119.** | в. Мадагаскар | |
| **120.** | Трыпалі і Кірынаіка | |

| | |
|---|---|
| **XIII.** | **Коратка растлумачце, якія падзеі ці арганізацыі атрымалі ў навейшай гісторыі прыведзеныя назвы.** |

За кожны правільны адказ – 2 балы

| | | |
|---|---|---|
| **121.** | “Саляны паход” | |
| **122.** | “Хлебны мір” | |
| **123.** | “Салетраная вайна” (Селитерная война) | |
| **124.** | “Стальны пакт” | |
| **125.** | “Удар літаўраў” | |

| | | |
|---|---|---|
| **126.** | “Чырвоная капэла” | |
| **127.** | “Рэвалюцыя ў спальным вагоне” | |

| | |
|---|---|
| **XIV.** | **Падбярыце агульнае паняцце да прапанаваных элементаў.** |

За кожны правільны адказ – 1 бал

| | | |
|---|---|---|
| **128.** | Свяшчэнная, шасцідзённая, халодная | |
| **129.** | Прэзідэнцкая, бананавая, дэмакратычная | |
| **130.** | Чацвёртая, свецкая, выканаўчая | |
| **131.** | Цёмная, карнавальная, Варфаламееўская | |
| **132.** | Усечаная, фінансавая, егіпецкая | |
| **133.** | Белы, Раманавых, культуры | |
| **134.** | Дзесяцінная, прыходская, Ніжняя | |
| **135.** | Непрыступная, старая, Брэсцкая | |
| **136.** | Вялікі шаўковы, бурштынавы, “з вараг у грэкі” | |
| **137.** | Залаты. Слановай Косткі, лазурны | |

| XV. | **Пазнайце гістарычную асобу і запішыце прозвішча і імя.** |
|---|---|

За кожны правільны адказ – 2 балы

| **138.** | **139.** | **140.** | **141.** |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| ______________________ | ______________________ | ______________________ | ______________________ |

| **142.** | **143.** | **144.** | **145.** |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| ________________ | ________________ | ________________ | ________________ |

| 146. | 147. | 148. | 149. |
| --- | --- | --- | --- |
|  |  |  |  |
| ______________ | ______________ | ______________ | ______________ |